ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (1040) ● ЧАЦВЕР, 31 студзеня 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

## Сёння ў нумары:

● СУСТРЭЧА З ГЕРОЕМ КОСМАСУ ● ЗАДАЧЫ НАРОДНЫХ КАНТРАЛЁРАЎ ● ЭСТАФЕТУ ПРЫНЯЛІ ЗАВОЧНІКІ ● БЕРАГЧЫ КНІЖНЫЯ СКАРБЫ ● НА СПАРТЫЎНАЙ АРБІЦЕ

## ЭКСПЕДЫЦЫЯ НА ВОЗЕРА РЫЧЫ

Закончылася руплівая падрыхтоўка неабходнага абсталявання і рыштунку, абмеркаван і зацверджан план будучай экспедыцыі. 28 студзеня атрад супрацоўнікаў галіновай навукова-даследчай лабараторыі возеразнаўства, геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі В. А. Калечыца ў складзе 16 чалавек накіраваўся на адно з буйнейшых азёр Браслаўскага раёна — возера Рычы.

Экспедыцыя працягнецца 20 дзён. Атрад даследчыкаў правядзе складаную і працаёмкую работу па марфаметрычнай здымцы вадаёма, даследаванню біялагічных паказчыкаў, гідралагічнага і гідрахімічнага рэжымаў і характару донных адкладанняў. Атрыманыя даныя ў выніку складуць пашпарт возера.

Экспедыцыйная работа на азёрах у зімовых умовах патрабуе зладжанасці і вялікіх затрат энергіі. Па папярэдніх падліках, належыць зрабіць больш 50 прорубаў для прамераў глыбінь.

Улічваючы складанасць работы і асаблівасці зімовых пагодных умоў, хочацца пажадаць усім удзельнікам экспедыцыі здароўя, поспехаў і абавязкова добрага надвор'я.

**П. МІТРАХОВІЧ,**
**супрацоўнік лабараторыі возеразнаўства.**







Сардэчнай, прасякнутай сяброўскай непасрэднасцю, усхваляванай была сустрэча ва універсітэце з героем космасу Пятром Ільічом Клімуком.

З глыбокай увагай і захапленнем слухалі студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі цікавы расказ земляка.

Здымкі нашых фотакарэспандэнтаў Д. Прэса і М. Нечыпарэнкі адлюстравалі гэту выдатную падзею ва універсітэцкім жыцці.

## У РАБОЧАЙ АЎДЫТОРЫІ

У бліжэйшы час кола падшэфных арганізацый БДУ яшчэ больш расшырыцца. Па ініцыятыве кіраўніцтва хімічнага факультэта наладжваюцца шэфскія сувязі з буйной будоўляй — Бабруйскім шынным камбінатам. На будоўлю выязджалі старшыня праўлення арганізацыі таварыства «Веды» БДУ М. Я. Рэзнікаў і старшыня пярвічнай арганізацыі хімфака М. М. Гарошка.

Па дагаворанасці універсітэцкія лектары будуць весці адзін раз у месяц два цыклы лекцый: для майстроў і маладых спецыялістаў. Узгоднена тэматыка лекцый. Першыя з іх будуць прачытаны ўжо ў лютым.

Гэты кантакт па лініі лекцыйнай работы з'явіцца першым этапам ва ўстанаўленні больш цесных сувязей паміж хімічным факультэтам і камбінатам у навукова-вытворчым плане.

**Наш кар.**

# ШТОДЗЁННАЕ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА— *ЗАЛОГ ПАСПЯХОВАЙ РАБОТЫ*

## Народны КАНТРОЛЬ

На чарговым пасяджэнні парткома, якое адбылося на мінулым тыдні, былі разгледжаны вынікі справаздач і выбараў груп народнага кантролю. Адзначана, што сходы і канферэнцыі на факультэтах і ў іншых падраздзяленнях універсітэта прайшлі ў асноўным на высокім арганізацыйным і палітычным узроўні. Адбылася дзелавая, прынцыповая размова аб рабоце народных кантралёраў. Абмеркаванне пытанняў нязменна звязвалася з асноўнымі задачамі, якія вырашаюць калектывы, адзначаліся дасягнутыя поспехі і асноўныя недахопы ў працы факультэтаў, адміністрацыйна - гаспадарчай часткі, выдавецтва, друкарні і г. д. Народным кантралёрам дадзены наказы, у якіх вызначаны асноўныя задачы на будучы двухгадовы перыяд работы.

Поспех дзейнасці груп народнага кантролю ў многім будзе залежаць ад штодзённага і ўмелага кіраўніцтва з боку партыйных арганізацыі. У. І. Ленін лічыў адной з галоўных умоў паспяховай работы органаў народнага кантролю іх блізкасць да партыі, партыйнае кіраўніцтва.

У справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXIV з'езду партыі адзначана: «У сістэме савецкай сацыялістычнай дэмакратыі важнае месца займаюць органы народнага кантролю, у рабоце якіх цяпер прымаюць удзел мільёны рабочых, калгаснікаў, служачых. Партыя і далей будзе клапаціцца аб тым, каб ленінскія ідэі аб пастаянным і дзейсным кантролі з боку шырокіх мас непахісна ажыццяўляліся».

Адсюль вынікае абавязак усіх пярвічных партыйных арганізацый праяўляць пастаянную увагу да работы народных кантралёраў і выкарыстоўваць гэтую вялікую грамадскую сілу ў рашэнні задач, якія стаяць перад калектывамі.

Дабіваючыся далейшага паляпшэння работы груп народнага кантролю, важна перш за ўсё павысіць патрабавальнасць да камуністаў, якія нясуць высокае і ганаровае званне дазорных народа, рэгулярна заслухоўваць іх справаздачы і паведамленні аб выкананні адказнага даручэння, адзначаць тых, хто працуе добрасумленна, ініцыятыўна і прынцыпова, падцягваць пасіўных.

Належыць часцей выносіць на абмеркаванне партыйных бюро і партыйных сходаў асноўныя пытанні дзейнасці груп народнага кантролю, падтрымліваць абгрунтаваныя вывады і прапановы народных кантралёраў, з якімі яны звяртаюцца ў партыйныя арганізацыі.

Групы народнага кантролю толькі што прыступілі да работы. Важна, каб партыйныя арганізацыі дапамаглі ім зрабіць аналіз работы за папярэдні перыяд, вызначыць канкрэтныя меры па рэалізацыі крытычных заўваг і прапаноў, выказаных на справаздачна - выбарных сходах і канферэнцыях, і так размеркаваць абавязкі, каб кожны народны кантралёр меў пастаяннае і канкрэтнае даручэнне і мог на аснове асабістага вопыту, ведаў і здольнасцей праяўляць ініцыятыву ў рашэнні вызначаных задач.

Партыйныя арганізацыі павінны дапамагчы групам народнага кантролю скласці добрыя планы, якія б ахоплівалі асноўныя ўчасткі работы калектываў. Важна дабіцца таго, каб работа народных кантралёраў здзяйснялася рытмічна, планамерна, без спадаў або затуханняў.

Кантроль павінен насіць баявы, наступальны характар. У ходзе праверак належыць глыбока вывучаць стан спраў, даходзіць да сутнасці, абавязкова знаходзіць асоб, вінаватых у дапушчаных недахопах, і ставіць пытанне аб прыцягненні іх да адказнасці, дабівацца рэальнага выкаранення выяўленых недахопаў.

Неабходныя ўмовы высокай эфектыўнасці работы груп народнага кантролю — абставіны прынцыповай, таварыскай патрабавальнасці, аб'ектыўная крытыка і самакрытыка. Ліберальныя, непрынцыповыя адносіны да памылак і недахопаў у рабоце, засцярога, што крытычныя заўвагі, выказаныя на пасяджэннях груп, у выступленнях на партыйных сходах, на пасяджэннях саветаў факультэтаў, на вытворчых нарадах адмоўна адаб'юцца на аўтарытэце тых ці іншых таварышаў, могуць сур'ёзна знізіць значэнне кантралёрскай работы, ператварыць яе ў пустую фармальнасць. Паклапаціцца аб стварэнні прынцыповых абставін на факультэтах і ў іншых структурных падраздзяленнях універсітэта— першы абавязак партыйных арганізацый. Разам з тым, належыць рашуча абараняць народных кантралёраў, калі супраць іх апалчаюцца руплівцы «гонару мундзіру», бюракраты, парушальнікі дзяржаўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці.

Неабходна, каб партыйныя арганізацыі павысілі патрабавальнасць да кіраўнікоў, дабіваліся своечасовага і дзелавога рэагавання на прапановы і рэкамендацыі груп народнага кантролю. Бо калі няма зацікаўленай увагі да ініцыятывы народных кантралёраў, работа дазорных слабее, падае рэзультатыўнасць іх праверак, непазбежна звужаецца масавая база народнага кантролю.

Клопат аб устанаўленні і пастаянным умацаванні дзелавых сувязей груп народнага кантролю з грамадскімі кантралёрамі прафсаюзных арганізацый, штабамі і атрадамі «Камсамольскага пражэктара», каардынацыя іх работы дазволяць пазбегнуць паралелізму і дубліравання, дарэмнай траты часу і сіл і дадуць найбольшы эфект. Трэба сказаць аб тым, што ў мінулыя гады на многіх факультэтах такой каардынацыі не было, і зараз яе неабходна абавязкова наладзіць.

Ад партыйнага бюро у многім залежыць рэзультатыўнасць усіх гэтых звенняў грамадскага кантролю. Умелая каардынацыя, вывучэнне і абагульненне вопыту іх работы дапамагаюць пазбегнуць дубліравання, садзейнічаюць планамернай, мэтанакіраванай і эфектыўнай працы.

Нельга забываць указанне У. І. Леніна аб тым, што у ходзе праверак належыць шукаць і знаходзіць не толькі памылкі і недахопы, промахі ў рабоце, але і зерні станоўчага, рацыянальнага, якое заслугоўвае ўсямернай падтрымкі і ўкаранення на іншых участках работы. Менавіта на такую пастаноўку работы трэба нацэльваць групы народнага кантролю. Бо іх праверкі, рэкамендацыі і прапановы — гэта толькі пачатак карпатлівай і настойлівай работы па ліквідаванню выяўленых недахопаў або па ўкараненню станоўчага вопыту. Неаслабны кантроль за выкананнем прынятых рашэнняў — залог эфектыўнай работы.

Быць народным кантралёрам — ганаровая, але разам з тым і цяжкая справа. Яна патрабуе праяўлення волі, настойлівасці, значных і ўсебаковых ведаў, творчых пошукаў лепшых прыёмаў здзяйснення кантролю, найбольш дзейсных сродкаў выкаранення выяўленых недахопаў, шырокага распаўсюджання станоўчага вопыту. Таму неабходна, каб партыйныя арганізацыі ўдзялялі пастаянную ўвагу сістэматычнай вучобе народных кантралёраў, удасканаленню іх практычнага майстэрства.

Перад народнымі кантралёрамі БДУ стаяць вялікія і адказныя задачы, вызначаныя XXIV з'ездам КПСС, пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» і «Асновамі заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб народнай адукацыі». Поспех у іх выкананні будзе ў многім вызначацца пастаянным і ўмелым партыйным кіраўніцтвам.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**намеснік сакратара парткома, старшыня універсітэцкай групы народнага кантролю.**

# НА ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ АІНЕЙЦЫ — ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

## АДКАЗНАЯ ПАРА

Цяпер на завочным факультэце адказная пара — пачалася зімовая экзаменацыйная сесія. Рэктарат, кафедры, дэканат завочнага факультэта правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да сесіі.

Пытанні завочнага навучання былі прадметам спецыяльнага абмеркавання на пасяджэннях вучоных саветаў гістарычнага, юрыдычнага і некаторых іншых факультэтаў, у партыйнай арганізацыі геафака.

Асабліва многа зрабілі для паляпшэння работы на завочным факультэце кафедры грамадскіх навук: кафедры гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў; навуковага камунізму; марксісцка-ленінскай філасофіі. Тут не толькі абмяркоўваліся вынікі мінулай экзаменацыйнай сесіі, але былі вызначаны і шматлікія мерапрыемствы, каб палепшыць вучобу завочнікаў. У гэтых калектывах паклапаціліся аб выданні шматлікіх спецыяльных метадычных дапаможнікаў, падручнікаў і іншай вучэбна-метадычнай літаратуры. Аналагічныя пытанні рашаліся і на кафедрах філалагічнага, гістарычнага факультэтаў, факультэта журналістыкі і інш.

Вучэбны працэс на завочным факультэце здзяйсняецца асноўным саставам выкладчыкаў універсітэта. Большасць кафедр улічвае спецыфіку падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, імкнецца прыцягнуць да работы з завочнікамі найбольш кваліфікаваных работнікаў, прафесараў, дацэнтаў, загадчыкаў кафедр.

Вялікая работа праводзіцца дэканатам завочнага факультэта ў перыяд паміж сесіямі. Сістэматычна арганізуюцца кансультацыі, датэрміновая здача экзаменаў і залікаў, устаноўлены дні завочніка.

З году ў год умацоўваюцца сувязі дэканата факультэта з установамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, дзе працуюць нашы студэнты.

Праведзеная работа не магла не адбіцца на паспяховасці студэнтаў. Паспяхова выканалі план 84 працэнты студэнтаў - завочнікаў. Сур'ёзныя адносіны да вучобы, глыбокія веды характарызуюць тую частку завочнікаў, якія вучацца на аддзяленнях, адпавядаючых профілю работы студэнта. Сярод лепшых — Н. Ф. Нарчук (V курс, журфак), С. М. Ёрш (IV курс, беларускае аддзяленне), В. Л. Дубоўскі (III курс, журфак), Г. В. Варалаў (IV курс, гістфак), З. К. Аўдзейчык (геафак), Е. Н. Роўда (матфак), Т. Б. Федзіна, М. М. Філончык (I курс, юрфак). Гэтыя студэнты вучобу лічаць сваёй важнай і адказнай задачай, сур'ёзна адносяцца да падрыхтоўкі да экзаменаў і залікаў, сістэматычна працуюць у перыяд паміж сесіямі.

На жаль, не аб усіх гэта можна сказаць, бо некаторая частка студэнтаў-завочнікаў з сесіі ў сесію атрымлівае нездавальняючыя адзнакі, спрабуе спісваць у таварышаў кантрольныя і курсавыя работы. Так, напрыклад, студэнты А. І. Ліпляніна (беларускае аддзяленне), Р. Н. Кушылевіч, С. В. Пухоўская (журфак), Т. І. Паркіна (геафак), В. П. Цурко (матфак) сістэматычна «перабіраюцца» з курса на курс з пераэкзаменоўкамі, хранічна не выконваюць вучэбны план.

Дэканат завочнага факультэта вымушан неаднаразова напамінаць нядбайным студэнтам аб неабходнасці ліквідаваць акадэмічную запазычанасць, даводзіцца весці непатрэбную перапіску з недысцыпл і н а ванымі людзьмі.

За нядобрасумленныя адносіны да вучобы былі выключаны з ліку студэнтаў Т. В. Вінаградава (V курс біяфака), Л. В. Герасіменка, Г. С. Клёстава, З. І. Ханіна (III курс біяфака), Л. А. Арэхоўская, Р. І. Баброўскі (журфак) і іншыя.

Нежаданне сур'ёзна вучыцца прыводзіць асобных студэнтаў да таго, што яны «атакуюць» выкладчыкаў дома, літаральна выпрошваюць адзнакі.

Бясспрэчна, падобныя факты адзінкавыя, і не яны характарызуюць твар студэнта-завочніка, аднак яны яшчэ маюць месца, як і выпадкі парушэння вучэбнай дысцыпліны, правіл унутранага распарадку.

Самадысцыпліна — залог добрай паспяховасці, яна садзейнічае выпрацоўцы навыкаў самастойна плануемай работы, працаздольнасці.

...Ідзе сесія. Дэканат завочнага факультэта, увесь прафесарска-выкладчыцкі састаў павінны прыкласці максімум намаганняў для паспяховага яе правядзення; кафедрам неабходна павысіць патрабаванні да якасці лекцый і практычных заняткаў, часцей практыкаваць узаеманаведванне, адкрытыя лекцыі на завочным факультэце, узяць пад строгі кантроль работу са студэнтамі-завочнікамі.

**Н. МАЖЭЙКА,**
**дэкан завочнага факультэта.**





## І ЎСЁ ПАЎТОРЫЦЦА...

Ранні зімовы вечар люстэркам вокнаў заглядвае ў аўдыторыі. Тут пакуль пуста і ціха. Толькі з ярка асветленага калідора даносіцца прыглушаны шум. Ля дзвярэй 717-й, дзе стаіць група дзяўчат, раз-пораз чуецца незнаёмае: папуляцыя, біяцыноз... У апошні раз перад экзаменам кансультуюць адна другую Люда Яшанкова і Алена Альфяровіч.

Вось ужо раскладзены білеты, і дацэнт У. П. Ляхновіч запрашае першых жадаючых. Цішыня аўдыторыі парушаецца на момант шапаценнем паперы, шорганнем адсунутых крэслаў, і зноў — ціха. Толькі скрыпяць алоўкі, з-пад якіх на паперы з'яўляюцца роўныя радкі—планы адказаў на пытанні білета.

«Першую ластаўку» я чакаю за дзвярыма разам з іншымі дзяўчатамі І групы заолагаў. Хтосьці заглядвае ў прыадчыненыя дзверы:

— Галя Індушка адказвае. Ведаеце, яна ў нас з першага курса вучыцца толькі на выдатна і добра.

А Галя выходзіць крыху расчараваная:

— Толькі «чацвёрка». І білет жа добры папаўся. Відаць, трэба было жывей гаварыць.

Нягучна, але ўпэўнена вядзе гаворку Вячаслаў Фаменкаў. Некалькі дадатковых пытанняў — і ў залікоўцы заслужаная «чацвёрка».

Спецкурс «Экалагічная фізіялогія» нялёгкі, ды і ў білеце аж тры пытанні. Таму такі засяроджаны твар у Марыі Масель, таму хвалюецца Ганна Шымановіч.

Здавалася б, усё звычайна: і гэты экзамен, і хваляванні. Так яно і ёсць. Адрозненне толькі ў тым, што усе гэтыя хлопцы і дзяўчаты яшчэ і працуюць. Яны — завочнікі, студэнты VI курса аддзялення біялогіі завочнага факультэта.

Марыі Масель «дастаўся» білет № 9. Яна старанна піша, потым адкладвае ў бок аловак і уважліва слухае адказ сяброўкі. І калі тая запінаецца, губы дзяўчыны машынальна шэпчуць працяг.

Марыя — медыцынскі работнік, працуе ў горадзе Ляхавічы Брэсцкай вобласці. Усе пяць год дамініруючай адзнакай у яе заліковай кніжцы была «пяцёрка». На запытанне, ці не цяжка гэта, яна адказвае:

— Я медык, мне інакш нельга.

Дзяўчына ў пушыстай шапачцы, перш чым узяць білет, заплюшчвае вочы. Уладзімір Пятровіч усміхаецца. Чаго толькі не даводзілася бачыць яму ў час экзаменаў! Вось і гэтыя — дарослыя людзі, а тут, як усе студэнты: цягнуць білет толькі левай рукой, а пад пятку, мабыць, кладуць пятак ці просяць каго-небудзь з родных патрымаць крыху палец у чарніліцы.

«Пушыстая шапачка», здаецца, і не збіраецца нічога занатоўваць у сваёй паперцы. Спрабую прасачыць за яе позіркам, але безвынікова. Ну, спее альбо «двойка» альбо адказ-экспромт.

А калі Галіна Гайдыш пачынае адказваць, з палёгкай уздыхаю: усё нармальна. Што ўваходзіць у паняцце росту арганізма, чым вызначаецца ёмкасць біясферы для чалавека — на гэтыя і іншыя пытанні маладая настаўніца з Бабруйска адказвае добра.

Спецкурс здала амаль палова групы — і ніводнай «тройкі».

Побач, у 713-й, II група здае фітапаталогію. Вынік падобны. Што гэта, вялікая адказнасць ці нешта іншае?

— І адказнасць таксама, але галоўнае — цікавасць да прадмета, — тлумачыць экзаменатар Адам Сямёнавіч Шуканаў. Перад пачаткам спецкурсаў мы прапануем студэнтам пазнаёміцца з пэўнай літаратурай. Самыя важныя і цяжкія пытанні разбіраем на лекцыях.

Ну, а аб тым, што завочнікі народ сур'ёзны, думаю, і гаварыць не трэба.

Прыступкі самі нясуць цябе з сёмага паверха на першы. Спагадліва гардэробшчыцы:

— Ну, як, здалі?

— Так,—у адказ.

І вось ужо твар абдае марозным паветрам, а на душы —лёгка і хораша...

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**



**НА ЗДЫМКАХ:**

**— Добра. Наступнае пытанне,— гаворыць эказаменатар дацэнт У. П. Ляхновіч,**

**І Вячаслаў Фаменкаў пачынае расказваць пра класы хімічных рэчываў, якія ўтвараюць біясферу.**

**Ідзе экзамен па спецкурсу «Экалагічная фізіялогія» ў студэнтаў VI курса біялагічнага аддзялення завочнага факультэта.**

◆

**У час экзамена па фітапаталогіі.**

Фота **Д. Чаховіча.**

## У ДОБРЫ ШЛЯХ!

Часта мне ўспамінаецца такі выпадак. Я тады вучыўся ў 10-м класе. Неяк, разбіраючы дамашнія сачыненні, настаўніца рускай мовы і літаратуры Людміла Сяргееўна Лук'янчык сказала: «Быць табе, Валодзя, філолагам!»

Словы маёй любімай настаўніцы сталі прарочымі. Любоў да кнігі, да роднага слова, цяга да ведаў прывялі мяне, як і большасць маіх аднакурснікаў, на філалагічны факультэт.

З таго часу прайшло ўжо шэсць год, напружаных, хвалюючых, неспакойных. Цяпер, калі ўсё гэта пройдзена, пражыта, хочацца яшчэ раз вярнуцца назад, у студэнцкае жыццё, успомніць усё, чым багаты былі гады вучобы.

На першы курс нашага аддзялення было залічана 98 чалавек. Гэта ў асноўным былі настаўнікі пачатковых класаў, работнікі клубаў і бібліятэк; многія працавалі на заводах, у дашкольных установах. Але ў працэсе вучобы пераканаліся, што ва універсітэт прыйшлі не выпадкова. А таму многія праз два-тры гады перайшлі працаваць у сярэднія і васьмігадовыя школы.

Курс у нас падабраўся дружны, працавіты. Ужо першую экзаменацыйную сесію большасць студэнтаў здала толькі на «добра» і «выдатна». Ды і потым тэмпаў мы не збаўлялі. Асабліва хочацца адзначыць Алу Леанідаўну Мураўёву. Сціплая, працавітая, добрасумленная, яна за шэсць гадоў вучобы атрымала толькі дзве здавальняючыя адзнакі. Вызначаецца стараннасцю і Ганна Васільеўна Доўнар. Ёй ужо за сорак год. Закончыўшы пасля вайны педагагічнае вучылішча, Ганна Васільеўна працавала ў пачатковых класах. Але зразумела, што тых ведаў, якія набыла ў вучылішчы, цяпер ужо недастаткова. І таму паступіла ва універсітэт. Усе сесіі яна здавала паспяхова, хоць вучыцца ёй было значна цяжэй, чым нам, маладым. Хочацца назваць прозвішчы і другіх студэнтаў, у заліковых кніжках якіх пераважная большасць добрых і выдатных адзнак. Гэта Валянцін Аляксандравіч Вялеська, Марыя Міхайлаўна Гілевіч, Валянціна Іванаўна Якімовіч, Лілія Іванаўна Раманейка і многія іншыя.

Трэба адзначыць, што асаблівага «адсеву» студэнтаў у нас не было. Да шостага курса мы дайшлі амаль у поўным складзе. Вядома, у гэтым не толькі наша заслуга. З намі працавала многа цікавых і добрых педагогаў. У кожнага з іх свой характар, асабістая методыка, своеасаблівы падыход да студэнтаў. Але ўсіх аб'ядноўвае любоў да працы, жаданне перадаць веды і вопыт. Мы ніколі не забудзем Дзіяну Пятроўну Багрову, Вольгу Васільеўну Казлову, Вячаслава Пятровіча Рагойшу, Надзею Сямёнаўну Мажэйка, Таццяну Яфімаўну Дудараву, Івана Якаўлевіча Нявуменку, Ніла Сямёнавіча Гілевіча, Алену Андрэеўну Скачко, Сцяпана Хусейнавіча Александровіча, Барыса Ізраілевіча Касоўскага і многіх-многіх іншых. Шчырае вам дзякуй, дарагія выкладчыкі! Мы заўсёды будзем памятаць пра вас. Магчыма, часам мы і засмучалі вас, прыносілі лішні клопат. Даруйце нам за гэта. Мы будзем старацца, каб намаганні вашы не прапалі марна. Усё, чаму вы нас навучылі, мы будзем выкарыстоўваць у сваёй практыцы.

Хутка, вельмі хутка мы расстанемся з універсітэтам. Апошняя сесія ўжо здадзена. Цяпер галоўны наш клопат — добра падрыхтавацца да дыпломных работ і дзяржаўных экзаменаў. І хочацца верыць, што і тут мы парадуем сваіх выкладчыкаў добрымі і грунтоўнымі ведамі.

Многія з нас не думаюць на гэтым заканчваць вучобу. Некаторыя мараць вучыцца ў аспірантуры, займацца даследчай работай, прысвяціць сябе літаратурнай справе. Што ж, у добры шлях, дарагія сябры!

**У. ВЕСЯЛУХА,**
**стараста VI курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры.**

# З ПАЧУЦЦЁМ АДКАЗНАСЦІ

Здаецца, зусім нядаўна гэта было. Абітурыентамі мы старанна рыхтаваліся да ўступных экзаменаў, хваляваліся, трымаючы іх. Кожнаму хацелася стаць знаўцам справы, якую выбралі ў жыцці. Многія з нас добра ведалі ўжо сваю прафесію: працавалі ў рэдакцыях газет, на радыё, тэлебачанні, былі нештатнымі карэспандэнтамі перыядычнага друку.

Здаецца, нядаўна, і ў той жа час даўно з'явіліся ў заліковых кніжках першыя адзнакі. Праз некалькі дзён у іх будуць пастаўлены апошнія. Хутка хвалюючая, адказная пара — дзяржаўныя экзамены. Аднак яна не застане нас знянацку. Да яе рыхтаваліся многа і настойліва, на працягу ўсёй вучобы. Безумоўна, усё давалася нялёгка. Вытворчая і грамадская дзейнасць, многія іншыя клопаты забіралі шмат часу. І ўсё ж кожны памятаў аб падручніках, кантрольных работах. І вось апошняя сесія. Не ўсе, хто шэсць гадоў таму назад стаў студэнтам-завочнікам аддзялення журналістыкі, удзельнічаюць у ёй. Заканчваюць вучобу старанныя, настойлівыя ў ажыццяўленні пастаўленых перад сабой задач. Сярод іх супрацоўнік любанскай раённай газеты Уладзімір Дамарацкі, супрацоўнік Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкома Міхаіл Конан, адказны сакратар лепельскай раённай газеты Васіль Хаванскі, рэдактар шматтыражнай газеты Таццяна Цяценькіна і многія іншыя, у чыіх заліkоўках добрыя і выдатныя адзнакі.

Неўзабаве мы пакінем сцены універсітэта. Аднак гэта не азначае, што развітваемся з ім назаўсёды. На ўсё жыццё застануцца ў памяці гады вучобы, нязгаснай будзе наша ўдзячнасць тым, хто зрабіў усё магчымае, каб сталі мы кваліфікаванымі спецыялістамі.

І дзе б мы ні працавалі, пастараемся ў поўнай меры прымяніць на практыцы атрыманыя ў нашым універсітэце веды, з глыбокім пачуццём адказнасці служыць справе Камуністычнай партыі і савецкага народа.

**М. РАБІЗА,**
**староста VI курса аддзялення журналістыкі.**

# ПА ПРАГРАМЕ КАФЕДРЫ



Кожны год больш 50 працэнтаў завочнікаў абараняе дыпломныя работы на кафедры сістэматыкі раслін. Многія з іх з'яўляюцца супрацоўнікамі навукова-даследчых інстытутаў, працуюць на доследных станцыях, у саўгасах і лясніцтвах. Гэтыя ўстановы маюць сваю матэрыяльную базу і, як правіла, вядуць даследаванні па вялікаму колу спецыяльных пытанняў. Напрыклад, інстытут, у якім я працую, вядзе даследаванні вытворчасці прадуктаў харчавання з бульбы.

Інстытут мае свае сховішчы, добра абсталяваныя лабараторыі, дзе можна ставіць любыя доследы, якія датычацца асаблівасцей захавання бульбы, а таксама доследы, неабходныя па дыпломнай рабоце. Гэта дало мне магчымасць весці навуковую работу па тэме «Уплыў звычайнай паршы на ўтрыманне крухмалу ў бульбе ў перыяд яе захавання».

Наша кафедра не валодае такой багатай матэрыяльнай базай, але кола яе навуковых інтарэсаў шырокае. Гэта вывучэнне запасаў лекавых, меданосных, лугавых раслін, даследаванні вышэйшых і ніжэйшых раслін, вывучэнне асаблівасцей грыбоў, вывучэнне хвароб раслін і г. д. Таму не дзіўна, што тэмы дыпломных работ пачынаюць збліжацца з кірункам навуковых даследаванняў па асноўнай рабоце і з адным з напрамкаў навуковай дзейнасці кафедры. Такі сінтэз вельмі перспектыўны. Студэнт-завочнік сумесна з навуковым кіраўніком распрацоўвае праграму будучай дыпломнай работы, займаецца асваеннем методык даследаванняў. Прычым усёй неабходнай літаратурай яго забяспечвае кафедра. Пасля такой падрыхтоўкі студэнт можа прыступіць да правядзення доследаў, якія здзяйсняе на базе сваёй установы.

Часам для выканання работы патрабуюцца кансультацыі па адпрацоўцы методык вучоных іншых навучальных устаноў. У такіх выпадках кафедра заўсёды дапамагае ў іх арганізацыі.

Звычайна студэнт-завочнік вядзе даследаванні па тэме на працягу двух год. Пры такой рабоце навуковы кругагляд студэнта значна расшыраецца, ён уносіць пасільны навуковы ўклад у агульную працу свайго калектыву, набывае веды, якія практычна яму неабходны.

**Н. СТРАЛЬЦОВА,**
**студэнтка VI курса.**

## ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

У 1946 годзе ў БДУ было ўсяго 525 студэнтаў-завочнікаў.

У 1957 годзе завочнай формай навучання было ахоплена 2 792 чалавекі.

Цяпер на завочным факультэце БДУ навучаецца 4 626 чалавек.

# АПОШНІ ЗВАНОК

Заўтра празвініць апошні званок для студэнтаў-філолагаў VI курса завочнага факультэта. Наперадзе — абарона дыпломных работ. Усе студэнты атрымалі тэмы і многія ўжо прыступілі да іх распрацоўкі.

Перад апошнім званком мы папрасілі некаторых выпускнікоў падзяліцца ўражаннямі аб вучобе, планамі ў рабоце над дыпломнымі.

— Мяне зацікавіла тэма па мове: «Методыка выкладання лексікі ў 4—5-х класах», — гаворыць Валянціна Іванаўна Якімовіч. — Сама я працую настаўніцай роднай мовы і літаратуры ў 4—5-х класах Дзеравянчыцкай васьмігадовай школы Слонімскага раёна. Тэма гэта зацікавіла сваёй актуальнасцю. У цяперашні час, калі слоўнікавы запас інтэнсіўна папаўняецца, вывучэнне лексікі ў школе — вельмі важнае пытанне. Работу буду пісаць на практычным матэрыяле, які накапіўся за час работы ў гэтых класах.

Вучоба ва універсітэце мне значна дапамагла ў рабоце.

Лілія Вікенцьеўна Шаблоўская першы год працуе настаўніцай у Дуброўскай сярэдняй школе Маладзечанскага раёна.

— Праца настаўніцы мне спадабалася. Раней я працавала лабаранткай у школе. Адным словам, з першага класа ў школе. У сваёй грамадскай і педагагічнай дзейнасці імкнуся выхоўваць у дзяцей пачуцці патрыятызму і інтэрнацыяналізму. Цяпер на ўроках літаратуры і ў пазакласны час праводжу з дзецьмі гутаркі па прачытаных творах савецкіх і зарубежных пісьменнікаў, а таксама аб прагледжаных тэлеперадачах і кінафільмах патрыятычнага і інтэрнацыянальнага напрамку. І таму невыпадкова ўзяла тэму дыпломнай работы «Інтэрнацыянальныя матывы ў творчасці М. Танка».

Многія студэнты-завочнікі ўзялі тэмы работ па фальклору і дыялекталогіі. Некаторыя ўжо сабралі фактычны матэрыял, займаюцца яго апрацоўкай. Любоў да народнай творчасці— невыпадковая з'ява: большасць студэнтаў жывуць сярод саміх носьбітаў фальклору. Важна і тое, што клапатлівая праца студэнтаў не застаецца без увагі. Сабраны імі матэрыял уваходзіць у кнігі па фальклору і дыялекталогіі, якія рыхтуюцца на кафедрах беларускай і рускай мовы і літаратуры.

Не засталіся без увагі і тэмы па літаратурнай крытыцы. У сувязі з пастановай ЦК КПСС «Аб літаратурна - мастацкай крытыцы» на факультэце вядзецца значная работа. І таму многія студэнты выказалі жаданне папрацаваць у гэтай галіне.

Студэнты-завочнікі рускага аддзялення Л. Ф. Ляхоўская, Р. Х. Муніц, А. Ю. Шэйніна, В. А. Каменева ўзялі такія тэмы работ, як «Накіроўваючая роля КПСС у развіцці літаратуры», «Л. Ляонаў— літаратурны крытык», «М. Горкі як літаратурны крытык», «А. Луначарскі — літаратурны крытык».

Выбару гэтых тэм садзейнічаў і спецкурс па сацыялістычнаму рэалізму і сучаснаму літаратурнаму працэсу, які вяла дацэнт В. А. Захарава.

Адным словам, пачатак зроблен. І хочацца верыць, што з пастаўленымі задачамі студэнты справяцца, выканаюць работы ў тэрмін і на высокім навукова - тэарэтычным узроўні.

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

# НАШ ПАЎСЯДЗЁННЫ КЛОПАТ

Кафедра гісторыі БССР у сваёй рабоце вялікую ўвагу ўдзяляе студэнтам-завочнікам. Усе выкладчыкі працуюць на завочным факультэце. Амаль на кожным пасяджэнні кафедры абмяркоўваюцца пытанні, звязаныя з вучобай студэнтаў-завочнікаў, кантролем за іх самастойнай работай. Сістэматычна выкладчыкі знаёмяцца з канспектамі студэнтаў па вучэбнай літаратуры.

Кафедра шырока практыкуе правядзенне кансультацый і калёквіумаў у дні завочнікаў, а таксама прыём экзаменаў па асобных курсах у міжсесійны перыяд.

За апошнія гады значна павысілася якасць курсавых і дыпломных работ. Многія з іх утрымліваюць элементы навуковага даследавання. На пасяджэнні кафедры 26 студзеня была адзначана паспяховая работа студэнтаў В. А. Нагорнага, тэма дыпломнай работы якога — «Удзел працоўных мас Карэліцкага раёна ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945 гг.»), А. Ф. Мароза—«Аперацыя «Баграціён» (1944 г.) у мемуарнай літаратуры», Т. В. Паўлюшчанкі —«Культурнае будаўніцтва ў Лоеўскім раёне ў пасляваенныя гады» і інш.

Вопыт мінулых год паказаў, што слабым месцам у падрыхтоўцы курсавых і дыпломных работ студэнтаў з'яўляецца няўменне правільна аформіць навуковы апарат. У сувязі з гэтым кафедра распрацавала метадычны дапаможнік «Афармленне курсавых і дыпломных работ» к цяперашняй экзаменацыйнай сесіі. Членамі кафедры распрацаваны новыя спецкурсы, якія чытаюцца для студэнтаў-завочнікаў: «Крытыка буржуазнай фальсіфікацыі гісторыі БССР», «Уклад беларускага народа ў развіццё савецка-балгарскай дружбы і супрацоўніцтва» і іншыя.

**Я. НЕСЦЯРОВІЧ,**
**выкладчык, партгрупорг кафедры.**



У дэканаце завочнага факультэта ідзе вытворчая нарада.

Фота Д. Чаховіча.

# ЗА ЯКАСЦЬ ВЕДАЎ

Экзаменацыйная пара настала і для завочнікаў. Якую работу трэба будзе правесці кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў са студэнтамі-завочнікамі, я папрасіла расказаць намесніка загадчыка кафедры М. В. Прылепку.

— Абмеркаваны асноўныя пытанні, што будуць высветлены ў лекцыях у час зімовай экзаменацыйнай сесіі. Больш грунтоўна і падрабязна студэнты пазнаёмяцца на лекцыях з прамовай Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на Сусветным кангрэсе міралюбівых сіл, гэтым выдатным тэарэтычным і палітычным дакументам.

Увага студэнтаў-першакурснікаў будзе сканцэнтравана на асноўных пытаннях ленінскай тэорыі сацыялістычнай рэвалюцыі, перамогі Вялікага Кастрычніка, на рашэннях VIII з'езда РКП(б) і іншых. Адным з вузлавых момантаў будзе вывучэнне працы У. І. Леніна «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме».

У завочнікаў II курса праграма больш шырокая. На лекцыях будзе асветлена дзейнасць партыі па мабілізацыі мас на рашэнне задач камуністычнага будаўніцтва.

Нельга гаварыць аб сесіі і не памятаць галоўнага — праблемы якасці ведаў. Яна павінна быць у цэнтры ўвагі. Глыбіня вывучэння грамадскіх навук у многім залежыць ад метадычнага майстэрства выкладчыкаў. І дацэнт М. В. Прылепка гаворыць:

— Наша кафедра звяртае вялікую ўвагу на правядзенне семінарскіх заняткаў. Выкладчыкі А. С. Шаўлюкевіч і А. В. Ераксін у час гэтай сесіі выявяць веды студэнтаў, дапамогуць ім найбольш глыбока разабрацца ў матэрыяле, растлумачаць незразумелае.

Усе завочнікі ў пачатку І курса атрымалі прыкладныя планы семінарскіх заняткаў, дзе ўказана і неабходная літаратура. Тут жа, на кафедры, ім даюцца метадычныя парады і праводзяцца кансультацыі.

Асаблівую ўвагу выкладчыкі кафедры аддаюць кантрольным работам. Дацэнт Э. А. Калініна, напрыклад, падрыхтавала даклад «Месца і роля кантрольных работ па гісторыі КПСС у сістэме завочнага навучання і методыка іх рэцэнзіравання», з якім выступіць на рэспубліканскай метадычнай канферэнцыі.

— Хочацца, каб студэнты-завочнікі больш увагі ўдзялялі вывучэнню гісторыі КПСС, асабліва студэнты геаграфічнага факультэта, — сказаў на развітанне М. В. Прылепка. — Вынікі летняй сесіі выявілі там недастатковую падрыхтоўку.

**С. МУХІНА,**

# СПЯВАЕ «ЛІРА»

Касцёр разгараўся. Усё вышэй шугала полымя. Здаваліся дэкарацыяй дрэвы, што выступілі ад святла ўперад. Звінела гітара... Да болю любімую мелодыю падхоплівала ўсё больш галасоў. Памужнелымі здаваліся твары маіх сяброў. Чулся ў песні трывога. Нібыта зніталіся ў ёй рамантыка работы і хваляванні юнацтва.

Край бярозавы, жытнёвай
смугою
Ты прынёс нам
перапёлчын плач,
Неба сінь і сонца залатое,
Лёгкі ўзмах буслінага
крыла.

Атрад спяваў «Рудабелку», песню, якая прагучала ўпершыню на фестывалі будаўнічых атрадаў, што працавалі ў Акцябрскім раёне Гомельскай вобласці.

Яе аўтары — байцы атрада «Буравеснік» філалагічнага факультэта БДУ. Мой расказ пра іх.

...Да фестывалю заставалася некалькі дзён. Для Анатоля Шушко, курсавога паэта, яны сапраўды былі цяжкімі. Цяпер ён усміхаецца: «Творчыя мукі перажываў». Яго душу ўскалыхнуў гэты легендарны партызанскі край. Агортвалі пачуцці, мроіліся словы. Думкі былі ясныя, але радкі складаліся цяжка, балюча. Хацелася дабіцца найбольшай праўдзівасці. Яшчэ зусім непрацаваны верш Уладзімір Ламека, Рычард Саматыя наўпэўнена напявалі. Словы лёгка кладліся на музыку. За вечар да адкрыцця фестывалю песню ўжо спяваў атрад. Так з'явілася ў атрада «Буравеснік» кроўная песня пра непакораную Рудабельскую рэспубліку. На фестывалі яе выканалі самі аўтары — ансамбль «Ліра», песня была прызнана лепшай. Атрад узнагароджан баянам.

А песня? Яна падхоплена і жыве. Яна — галоўная ў рэпертуары ансамбля.

«Ліра» ўзнікла два гады назад на беларускім аддзяленні філфака. Тое, што яе ўдзельнікі, трэцякурснікі Уладзімір Ламека, Рычард Саматыя, Анатоль Шушко, Мікола Цялега, Генадзь Юрэвіч — лепшыя сябры,— не маё адкрыццё. Ансамбль —увасабленне па-сапраўднаму мужчынскай дружбы. Як кажуць, радасць і бяда— усё напалам. Сябры любяць спяваць усюды: ля кастра, на турысцкай сцежцы, у час занняткаў па «ваенцы», на вечарах і канцэртах, у пакоі, дзе жывуць. І заўсёды з вялікім задавальненнем іх прымаюць слухачы.

Іх песні глыбока лірычныя, яны выконваюцца ў два галасы. Моцныя хлапечыя галасы выконваюць па-свойму «Крыніцы» і «Бярозавы сок».

Часта ансамбль прымае ўдзел у конкурсах, аглядах мастацкай самадзейнасці, але больш за ўсё ім прыемна выступаць у падшэфнай Красненскай школе Маладзечанскага раёна, на вечарах свайго факультэта.

З асаблівай цеплынёй успамінаюць «ліраўцы» вечар дружбы паміж хімфакам і філфакам. Былі запрошаны на яго і воіны. Зала прыціхла, калі спявала «Ліра».

**З. ГАЎРЫШЧУК.**

# ПРАЯВІЦЕ КЛОПАТ



У бібліятэку паступіла новая партыя літаратуры. Перш чым трапіць на паліцу, кніга атрымае тут пашпарт.



У студэнцкім прафілакторыі ёсць магчымасць не толькі добра адпачыць, але і папрацаваць над дыпломнай.



У цяперашні час, калі бібліятэкі імкнуцца найбольш поўна раскрыць свае фонды для чытачоў, кантроль за іх захаваннем павінен быць больш моцным. Страта і псаванне дэфіцытных падручнікаў прыводзіць да таго, што з-за неахайнасці ці злоснага намеру аднаго чалавека пакутуюць многія. Некаторыя студэнты з лёгкім сэрцам вырываюць старонкі з дэфіцытных падручнікаў, губляюць кнігі, не думаючы пра тое, што кніга, перш чым паступіць у бібліятэку, праходзіць вялікі шлях.

У кожную кнігу ўкладзена праца не толькі пісьменніка, вучонага, мастака, але і вялікай масы працоўных — ад працаўніка цэлюлозна-папяровай прамысловасці да наборшчыка і пераплётчыка. Гэта па-першае. А, па-другое, кнігі перавыдаюцца не так ужо часта.

У пачатку кожнага навучальнага года бібліятэчныя работнікі расказваюць першакурснікам аб правілах карыстання бібліятэкай, праводзяць гутаркі аб культуры чытання, аб захаванні фонду. За парушэнне правіл карыстання кнігамі да студэнтаў прымяняюцца адміністрацыйныя меры пакарання. Так, за вынас кніг з чытальнай залы была аб'яўлена вымова студэнту матэматычнага факультэта В. Курленю. Студэнту аддзялення гісторыі завочнага факультэта В. Д. Паўлюху за нетактоўныя паводзіны і незаконнае патрабаванне выдачы з чытальнай залы вучэбнай літаратуры была аб'яўлена строгая вымова з паведамленнем на месца работы. За неахайныя адносіны да кніг з фонду бібліятэкі была аб'яўлена строгая вымова студэнтам матэматычнага факультэта А. Прасяному, Ю. Крупнову, студэнткам філалагічнага факультэта Л. Ляонавай, С. Мускай і В. Белавусавай. Але, відаць, гэтых мер недастаткова.

Вялікае зло ў бібліятэцы — запазычанасць, ад якой пакутуюць перш за ўсё самі студэнты. Вельмі непрыемна бібліятэкару адмаўляць у кнізе, таворачы, што яе няма на месцы, у той час як кніга спакойна ляжыць у нерадзівага чытача без карысці. У гэтым годзе бібліятэка пачала дыферэнцыраванае абслугоўванне чытачоў першага курса. Кніг не хапала, таму што старэйшыя курсы не здавалі своечасова літаратуру. У цяперашні час у бібліятэцы налічваецца вялікая колькасць даўжнікоў. З іх фізікаў — 362, матэматыкаў — 234, філолагаў—135, журналістаў — 109, географаў — 103, гісторыкаў — 74, студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі—71, біёлагаў — 59. Значная частка запазычанасці прыпадае на прафесарска-выкладчыцкі састаў і супрацоўнікаў. Работнікамі бібліятэкі былі складзены спісы даўжнікоў-студэнтаў і перададзены ў дэканаты. Але эфект пакуль што невялікі.

Адзіны факультэт, дзе няма даўжнікоў, — хімічны. У гэтым вялікая заслуга дыспетчара факультэта Ларысы Сяргееўны Германовіч. Хацелася б, каб у яе знайшліся паслядоўнікі на іншых факультэтах.

Набліжаецца другі семестр, студэнты прыйдуць за кнігамі, а большасць іх знаходзіцца на руках.

Таварышы студэнты, здавайце кнігі! Іх чакаюць вашы сябры.

**В. МЯКОТА,**
**ст. бібліятэкар.**

# Спорт

## ЗНОЎ У МІНСКУ

З 29 па 31 студзеня ў іґравой зале універсітэта праходзіць першынство па валейболу мужчынскіх і жаночых каманд універсітэтаў Рыгі, Вільнюса, Тарту і Мінска.

Упершыню спартсменаў сустрэў Вільнюс. Прайшло шэсць гадоў, і сёлета, ужо другі раз, эстафету прымае Мінск.

У саставе жаночай каманды БДУ выступаюць студэнткі юрыдычнага факультэта, члены зборнай рэспублікі Наталля Мяснікова і Ірына Лагодзіч.

Першы дзень спаборніцтваў прынёс мінчанам адразу дзве перамогі: і жаночая і мужчынская каманды БДУ выйгралі ў зборных каманд рыжан з лікам 3:0.

Спадзяемся, што нашы валейбалісты правядуць таксама ўпэўнена і астатнія гульні.

**Наш кар.**

●●●

Зборная каманда БДУ вылецела ў Данецк, каб прыняць удзел у спаборніцтвах на прыз «Зімовыя канікулы».

У саставе каманды члены зборнай СССР Валянцін Кузьменка, Таццяна Надзеева, Людміла Кайгародава, Аляксандр Якаўлеў, Аляксандр Калдуненка і іншыя.

●●●

На традыцыйны турнір універсітэцкіх каманд па мастацкай гімнастыцы, які адбудзецца сёлета ў Тбілісі, адбылі гімнасткі БДУ— члены зборнай рэспублікі, майстры спорту Ларыса Вараб'ёва (юрфак), Ніна Гарбунова (журфак), Людміла Астапенка (гістфак) і іншыя.

●●●

Пазаўчора ў корпусе філалагічнага факультэта пачаўся турнір па фехтаванню. Сярод гасцей—спартсмены з Азербайджанскага універсітэта.

●●●

Паспяхова стартавалі ў зімовай спартакіядзе хакеісты зборнай БДУ, якія выйшлі ў фінал першынства вну па Мінскай зоне.

Дабіліся поспеху таксама каманда па настольнаму тэнісу і жаночая зборная па баскетболу.

●●●

Працягваюцца спартакіяда «Здароўе» і здача норм ГПА сярод супрацоўнікаў БДУ. У праграме спартакіяды спаборніцтвы па валейболу, баскетболу, ручному мячу, лёгкай атлетыцы, лыжах, шашках, шахматах, рыбнай лоўлі.

Паспяхова выступаюць за свае калектывы наменнік дэкана гістфака У. Л. Ціток, кандыдаты навук Г. А. Драбушэвіч, М. Р. Рафальскі, чэмпіён таварыства «Буравеснік» па шашках У. В. Беляеўскі і многія іншыя.

Першае месца ў спаборніцтвах па ручному мячу заваявала кафедра фізічнага выхавання. Паспяхова выступае калектыў НДІ прыкладных фізічных праблем.

**У. ЦІТАРУК,**
**старшыня праўлення спортклуба БДУ.**

# СМЕХ СКРОЗЬ СЛЁЗЫ

## ОХ, УЖО ГЭТЫЯ ДЫЯЛОГІ

Выкладчык: І колькі часу вы рыхтаваліся да экзамена?

Студэнт: Па 26 гадзін у...

Выкладчык: А калі ж спалі?

Студэнт: О, прафесар, я яшчэ ў пачатку семестра выспаўся. На лекцыях.

□

Студэнт: ...Герой Дуніна-Марцінкевіча так і сыпле прымаўкамі.

Вось, напрыклад: любі жонку, як клюшку, але трасі, як грушку.

Выкладчык: Што .?!

□

Выкладчык: Вы адказваеце мне з заплюшчанымі вачыма. Паглядзіце, я не такі ўжо страшны.

Студэнт: Пастаўце «чацвёрку» — паверу.

**Сабраў С. Шлоўкіс.**

## ГРАМАЦЕІ

*Заява дэкану завочнага факультэта ад студэнта аддзялення правазнаўства К...*

«Прошу Вас на право получения мне оплачиваемого отпуска на время сессии экзаменационной. Так, как я с задержанием срока представил работу по немецкому языку на 11 дней по уважительным причинам: был болен в данном месяце, работаю на расстоянии 15 км и каждый день ездить приходиться за неимением квартиры, что моя зарплата единственным средством является в семье».

*Арфаграфія і пунктуацыя гэтага дакумента цалкам на сумленні аўтара.*

## ГУМАРЫСТЫ ПАНЯВОЛІ

*Доктар юрыдычных навук прафесар І. І. Гарэлік на працягу некалькіх год збірае забаўныя і кур'ёзныя выразы юрыдычнай тэматыкі. Крыніцай яму служаць вусныя адказы студэнтаў, курсавыя, дыпломныя і іншыя работы. Па гэтых матэрыялах прафесар І. І. Гарэлік зараз рыхтуе кнігу.*

*Мы папрасілі яго падзяліцца некалькімі ўзорамі калекцыі з нашымі чытачамі.*

Он умер, потому что болел антисклерозом.

Принцип Талиона — око за око, глаз за глаз.

Кража — это тайное похищение чужого имущества. А тайное—это такое похищение, которое виновный совершает незаметно для окружающих и самого себя.

Подсудимый догнал потерпевшего и нанес ему оскорбление ножом в спину.

Ответчик отцовство отрицает частично.

В камере медвытрезвителя вытрезвляющийся Зыков нанес удар вытрезвляющемуся Ахмедову и своим шумом мешал вытрезвляться другим вытрезвляющимся.

Предъявленного мне гражданина я знаю, так как поймал его у себя в кармане.

Задержан гражданин Петров—глухонемой. Причина задержания — публично выражался нецензурными словами.

Категорически отвергаю обвинение, что я будто бы мелкий хулиган, поскольку я человек с высшим образованием.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет» — орган партко ма, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 экз.
Газета выходзіць па чацвяргах.
Аб'ём—1 друк. ар.

Наш адрас: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 05060

Зак. № 143.